Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 22 (713) ● Пятніца, 14 чэрвеня 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

## МАЦНЕЮЦЬ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ СУВЯЗІ

**Днямі з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі вярнулася група студэнтаў філалагічнага факультэта. На працягу трох тыдняў яны былі гасцямі Іенскага універсітэта імя Фрыдрыха Шылера, наведалі таксама многія знамянальныя мясціны ГДР. Групу ўзначальваў дацэнт кафедры савецкай літаратуры Ігар Паўлавіч Кахно.**

**У канцы ліпеня на месячную азнаямленча-вытворчую практыку ў маладзёжны лагер Закапанэ (Польшча) адправіцца каля трыццаці студэнтаў трэціх-чацвёртых курсаў беларускага і рускага аддзяленняў. Практыкай будзе кіраваць дэкан факультэта Аляксей Арсенц'евіч Волк. У наступны месяц нашы філолагі будуць сустракаць студэнтаў Варшаўскага універсітэта. Большасць з іх працуе над тэмамі дыпломных па беларускай літаратуры перыяду 1903—1930 гадоў і мяркуе сабраць у Мінску з дапамогай сваіх сяброў неабходны матэрыял. З такімі ж мэтамі нашы студэнты накіруюцца ў сталіцу Польшчы.**

**Абмен студэнцкімі дэлегацыямі з брацкімі краінамі цяпер займае важнае месца ў вучэбнай і выхаваўчай рабоце нашага універсітэта.**

## НЯХАЙ ПЕРАМАГАЮЦЬ ДАСТОЙНЫЯ!

Не скончыліся яшчэ хваляванні вясенняй экзаменацыйнай сесіі, на ўсіх факультэтах ідзе праверка ведаў, набытых студэнтамі за год, а на экзаменацыйную лінейку ўжо стаў больш чым тысячны атрад абітурыентаў, якія паступаюць на завочны факультэт.

10 чэрвеня роўна ў 10 раніцы ў трох самых вялікіх універсітэцкіх аўдыторыях пачаўся першы экзамен — сачыненне па літаратуры. Сотні вачэй уважліва сочаць, як на дошцы з'яўляюцца назвы тэм: «Класавая барацьба ў вёсцы па раману М. Шолахава «Узнятая цаліна», «Тэма працы ў М. А. Някрасава і А. М. Горкага» і «Мая мара». У групах рускай мовы і літаратуры экзаменатары — кандыдат філалагічных навук Людміла Аляксандраўна Шаўчэнка і выкладчык Раіса Іванаўна Яраслаўцава. Паставіўшы апошнюю кропку, Людміла Аляксандраўна паварочваецца да аўдыторыі і, улавіўшы настрой абітурыентаў, прапаноўвае:

— Тэмы спадабаліся. Цяпер за работу!

Яшчэ некалькі хвілін роздуму — і вось ужо першыя радкі ляглі на паперу...

Апошнія дні перад экзаменамі прыёмная камісія працавала з вялікім напружаннем. Рыхтаваліся спісы, афармляліся і выдаваліся экзаменацыйныя лісты. Каля сталоў з табліцамі «Філасофія», «Журналістыка», «Біялогія», «Геаграфія» і іншых не змяншаўся паток наведвальнікаў, якіх цікавілі самыя разнастайныя пытанні: калі і дзе кансультацыі, які першы экзамен, ці можна яшчэ паспець здаць дакументы, які конкурс... І ўвесь апарат прыёмнай камісіі на чале з адказным сакратаром С. П. Бекешкам добра спраўляўся са сваімі нялёгкімі абавязкамі.

Мы пацікавіліся, хто ж імкнецца прадоўжыць сваю адукацыю ва універсітэце. Сярод тых, хто выбраў сваёй спецыяльнасцю геаграфію, многа выпускнікоў тэхнікумаў, работнікаў геалагічных арганізацый, настаўнікаў, тры тапографы, якія прадставілі дыпломы выдатніка — у асноўным людзі з даволі багатым вытворчым стажам. І сярод іх, вядома, першынство трымае настаўнік з Смалявіч М. І. Кіслоў. Шэсць год працаваў на вытворчасці Б. М. Шаўчэнка, работнік геалагічнага ўпраўлення, дзесяць год настаўнічае В. І. Селіхановіч з Салігорска.

Аддзяленне біялогіі прадстаўлена, напэўна, усімі раёнамі Беларусі. Абітурыенты тут у асноўным медыцынскія работнікі, выпускнікі медыцынскіх вучылішчаў, вельмі многа выдатнікаў.

На аддзяленне філасофіі паступае вялікі атрад рабочых: токары, слесары, будаўнікі.

Моцнае ядро газетчыкаў вызначаецца на аддзяленні журналістыкі. Літаратурныя супрацоўнікі раённых і шматтыражных газет, фотакарэспандэнты, карэктары, рабкоры і селькоры, актывісты друку аспрэчваюць права стаць студэнтам універсітэта. І аспрэчваюць не з пустымі рукамі. У асабістых справах супрацоўніка газеты «Трактар» А. К. Кальцова, літсупрацоўніка салігорскай газеты «Шахцёр» Л. Е. Якубовіча, фотакарэспандэнта рэчыцкага «Дняпроўца» Н. І. Дзегцярова, рабкора наваполацкага «Хіміка» Г. В. Касцюка і многіх іншых выразкі з газет з цікавымі нарысамі, рэпартажамі, карэспандэнцыямі, замалёўкамі, вершамі.

Спаборніцтва ведаў і эрудыцыі, працавітасці і настойлівасці пачалося. І няхай перамагаюць дастойныя!

А. НІКОЛЕНКА.





**НА ЗДЫМКАХ:** (уверсе) Л. А. Шаўчэнка толькі што запісала тэмы для сачыненняў; (унізе) першы экзамен пачаўся.

Фота І. АСКІРКІ.

## МАЛАЙЦЫ, МАТЭМАТЫКІ!

**Цяпер амаль кожны дзень універсітэцкага жыцця пачынаецца з экзаменаў. Ідзеш па калідорах і заўважаеш на дзвярах аўдыторый размашысты росчырк — «Экзамен». Фізікі і юрысты, філолагі і матэматыкі, географы і гісторыкі, студэнты падрыхтоўчага і іншых факультэтаў, разлічыўшыся з адным прадметам, рыхтуюць наступны.**

**У час экзамена адзін перад другім сустракаюцца выкладчык і студэнт, і ад якасці ведаў апошняга залежыць настрой гэтай сустрэчы.**

**У выкладчыка кафедры фізікі Генадзя Станіслававіча Кемброўскага добрае ўражанне пакінуў экзамен на другім курсе матэматычнага факультэта.**

**— У параўнанні з мінулагоднім другім курсам цяперашні лепш засвоіў праграмны матэрыял па фізіцы і лепш здаў экзамен,—расказвае Г. С. Кемброўскі.**

**Вельмі добрае ўражанне пакінула пятая група, пераважныя адзнакі тут — «добра» і «выдатна». Ні адной нездавальняючай няма ў восьмай групе. У дзевятай выдатныя адзнакі атрымалі 12 студэнтаў. Адчуваюцца сур'ёзныя адносіны да вучобы, імкненне глыбока пазнаць сутнасць прадмета. Ужо па тых пытаннях, якія былі зададзены на кансультацыях (а іх прадугледжвалася па дзве для кожнай групы) можна было меркаваць аб добрасумленнай падрыхтоўцы да экзамена. Праўда, разам з моцнымі ёсць даволі слабыя групы, як дзесятая, тут, напрыклад, палова адзнак здавальняючых, чатыры студэнты зусім не змаглі справіцца з прапанаваным заданнем.**

**І ўсё ж у заключэнне хочацца назваць тых, каго прыемна было слухаць, прыемна экзаменаваць. Вельмі добрыя, глыбокія веды паказалі на экзамене Н. Пракаповіч і Л. Пятрова. Іх адрознівае правільная мова, уменне лагічна думаць, разумець выкладчыка з паўслова.**

**А астатнія групы гэтага курса экзамен па фізіцы яшчэ чакае.**

**Ю. БЕРАЗОЎСКАЯ.**

## З ДАПАМОГАЙ КАФЕДРЫ

У Мінску адбыўся абласны семінар лектараў-атэістаў і арганізатараў атэістычнай работы, які быў скліканы Мінскім абкомам КПБ і кафедрай гісторыі філасофіі і логікі нашага універсітэта. З лекцыямі выступілі намеснік дырэктара Інстытута навуковага атэізма Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС В. І. Еўдакімаў і старшы навуковы супрацоўнік гэтага інстытута доктар філасофскіх навук Л. Н. Велікові́ч.

Удзельнікі семінара заслухалі інфармацыю аб рэлігійных арганізацыях Беларусі і асаблівасцях іх дзейнасці.

С. ЛАПІЧ.

## ПАКУЛЬ БЕЗ КАНІКУЛАЎ...

Кафедра гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў (загадчык Т. І. Прытыцкая) не спыняе метадычную работу і ў час экзаменацыйнай сесіі. Тут па-ранейшаму арганізуецца ўзаеманаведванне лекцый, абмеркаванне перадавога вопыту. Адкрыты семінар адбыўся ў дацэнта Р. С. Маханька на другім курсе біялагічнага аддзялення завочнага факультэта.

Студэнты-завочнікі добра падрыхтаваліся да заняткаў, пры адказах шырока выкарыстоўвалі рашэнні X з'езда партыі, працы У. І. Леніна «Аб нашай рэвалюцыі», «Лепш менш ды лепш», «Як нам рэарганізаваць Рабкрын» і іншыя. Семінар прайшоў актыўна.

А. ЯНЕЎСКІ.









# НЯВЫКАРЫСТАНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Студэнтам-філосафам на вывучэнне гісторыі філасофіі антычнасці і сярэднявяковуя адводзіцца цэлы год— звыш ста гадзін. Гэта не так ужо і мала, калі ўлічыць, што палова часу адводзіцца семінарскім заняткам, на якіх можна замацаваць атрыманыя на лекцыях веды, набыць неабходны вопыт аналізаваць складаныя тэарэтычныя праблемы. Карацей кажучы, у студэнтаў другога курса філасофскага аддзялення гістфака былі ўсе магчымасці глыбока засвоіць праграмны матэрыял.

Аб тым, як былі выкарыстаны гэтыя магчымасці, сведчаць вынікі экзамена. З дваццаці чатырох студэнтаў адзінаццаць атрымалі выдатныя адзнакі, дзевяць — добрыя, веды чатырох ацэнены на здавальняюча. Змястоўнымі, глыбока абгрунтаванымі адказамі парадавалі выдатнікі вучобы Т. Адула, Н. Беляковіч, Г. Санюк, О. Ігнаценка, Ю. Шынкар і іншыя. Характэрна, што многія студэнты добра знаёмы з літаратурай, якая нават не ўключана ў спіс рэкамендаванай па праграме. Гэта ў першую чаргу датычыцца даследаванняў савецкіх філосафаў. Напрыклад, В. Дунаеў пры адказе на пытанне па старажытнай індыйскай філасофіі выкарыстаў выдадзеныя за апошнія некалькі год кнігі савецкіх літаратуразнаўцаў, тэарэтыкаў атэізма. Дарэчы, ім напісана цікавая курсавая праца па сацыялагічных праблемах у буддызме. Можна спаслацца і на такі факт. Міхаіл Віннікаў, які здаваў экзамен у ліку першых, адказваў на пытанні білета без усякай падрыхтоўкі. Пытанні былі ж не з лёгкіх — тэорыя пазнання Платона і грамадска-палітычныя погляды Фамы Аквінскага. М. Віннікаў атрымаў таксама «выдатна».

Зацікаўленасць да вывучаемага перыяду гісторыі філасофіі праявілася і ў тым, што палова студэнтаў другога курса па гэтых пытаннях пісала курсавыя працы, большасць якіх вылучаецца самастойнасцю. Кожнаму аўтару хацелася сказаць штосьці сваё, выказаць свае адносіны да дыскусійных пытанняў. Многім гэта ўдалося. Тэма даследавання В. Далініна — «Развіццё поглядаў на чалавека ў старажытнай грэчаскай філасофіі» — зусім не асветлена ў нашай філасофскай літаратуры. Студэнт сабраў вялікі матэрыял, здолеў у значнай ступені прааналізаваць яго, абагуліць. На аснове курсавой «К. Маркс, Ф. Энгельс і А. Герцэн аб старажытнай філасофіі Грэцыі (параўнаўчая характарыстыка)» студэнт А. Байчораў падрыхтаваў вялікую працу, якая рэкамендавана на рэспубліканскі агляд-конкурс.

І ўсё ж вынікі экзаменаў маглі быць лепшымі. Справа ў тым, што некаторыя студэнты мала працавалі на працягу вучэбнага года, не праяўлялі актыўнасці на семінарах. Толькі гэтым можна растлумачыць той факт, што Ю. Пуцылеў, А. Літвіновіч, В. Новікаў атрымалі здавальняючыя адзнакі. В. Кароль добрасумленна адносіцца да вучобы, у яе заўсёды змястоўныя канспекты першакрыніц, яна ніколі не ідзе непадрыхтаванай на семінарскія заняткі. Але ж і яна адказвала пасрэдна. У чым справа! На думку выкладчыка, ёй трэба смялей і часцей выступаць на семінарскіх занятках, правяраць сябе, тады пытанне, якое пастаўлена інакш, чым у праграме ці ў падручніку, не будзе здавацца зусім новым, невядомым. Дарэчы, курсавая праца В. Кароль па філасофіі старажытнай Грэцыі ацэнена на добра.

Ёсць усе падставы вучыцца на выдатна ў такіх студэнтаў, як В. Качаргін, В. Новікаў, Э. Белкіна ды і ўсе астатнія. Трэба толькі глыбей вывучаць рэкамендаваную і нерэкамендаваную літаратуру, часцей спрабаваць свае сілы на практычных занятках.

# КЛОПАТЫ СЁННЯШНЯГА ДНЯ

ІНТЭРВ'Ю ДАЕ ЗАГАДЧЫК КАФЕДРЫ

Паўсядзённая праца калектываў шматлікіх кафедраў універсітэта характарызуецца своеасаблівымі рысамі. Наш карэспандэнт А. Паўлянкоў папрасіў загадчыка кафедры фізічнай геаграфіі СССР геолага-геаграфічнага факультэта Васіля Аляксеевіча Дзяменц'ева адказаць на некалькі пытанняў, што датычацца работы кафедры.

**— Якія задачы ў гэтыя дні Вы лічыце першаснымі?**

— Зараз у нас самая напружаная пара — сесія, абароны дыпломных, вучэбныя і вытворчыя практыкі. У гэтым годзе агульны аб'ём вучэбнай і выхаваўчай працы ў сувязі з пашырэннем прыёму ва універсітэт павялічыўся, і гэта патрабуе пэўнай мабілізацыі сіл, а значыць, і дакладнасці ў працы кожнага выкладчыка, асабліва куратараў груп.

Перад куратарамі першага курса (В. В. Салазанавым, С. М. Зубавым і інш.) часам узнікаюць і перашкоды. Цяжка выбраць час і месца для гутаркі са студэнтамі. Вы згодзіцеся са мною, што іншы раз проста неабходна інтымная размова студэнта з выкладчыкам. І тут паўстае пытанне: дзе? У калідоры? Але гэта месца не для сур'ёзнай размовы. У кабінеце? Пры вялікай колькасці людзей не кожны адкрые свае запаветныя думкі. Таму для гэтага мы выкарыстоўваем час вучэбнай і вытворчай практыкі.

**— Якім чынам Вы прыцягваеце студэнтаў да навукова-даследчай работы кафедры?**

— Часта студэнты працуюць з намі ў экспедыцыях, удзельнічаюць у рабоце навуковага гуртка. У гуртке фізічнай геаграфіі чытаюцца даклады, прадстаўляюцца на агляды работы. Гурток, якім кіруе старшы выкладчык Г. І. Марцінкевіч, падрыхтаваў даклады па выніках вытворчай экскурсіі на Каўказе, па матэрыялах вытворчай практыкі ў Мінскай і Гомельскай абласцях. Гэтыя экспедыцыі працавалі па дагаворанасці з АН БССР. Яны складалі атласы, займаліся вывучэннем сувязей тыпу пасяленняў з прыроднымі ўмовамі. Вынікі гэтых даследаванняў ляглі ў аснову дыпломных Зоі Дзядковай і Ядзі Дужык. Іх работы былі ацэнены на выдатна. Студэнткі Л. Позняк і Н. Мясаедава пад кіраўніцтвам прафесара А. Х. Шкляра займаліся вывучэннем мікраклімату Мінска і Лепельскага раёна.

**— Як кафедра папулярызуе фізічную геаграфію, як прыцягвае да гэтай навукі моладзь, школьнікаў?**

— Кафдера арганізоўвае цэлы шэраг лекцый, прысвечаных вынікам развіцця геаграфічнай навукі ў СССР і БССР. Мы ўжо прачыталі такія лекцыі для настаўнікаў Мінска і Віцебска. Хутка я паеду ў Гродна з лекцыяй па даручэнню геаграфічнага таварыства. Падтрымліваем мы сувязь і са школьнікамі. Чытаем для іх лекцыі, расказваем аб цікавай навуцы геаграфіі.

**— Які ўклад у скарбніцу навукі ўжо зрабілі супрацоўнікі кафедры да юбілею Беларусі?**

— Па дагаворанасці з Інстытутам геаграфіі АН СССР мы падрыхтавалі артыкул «Развіццё геаграфіі ў Беларусі за 50 год Савецкай улады», які быў надрукаваны ў першым нумары «Известий АН СССР» за 1968 год. Напярэдадні юбілейнага года выйшла з друку кніга «Беларусь» з серыі «Савецкі Саюз». У гэтай кнізе раздзел «Прырода Беларусі» быў напісаны мною і А. Х. Шклярам. Нядаўна выдавецтва «Вышэйшая школа» выпусціла кнігу «Каляндар прыроды Беларусі», якую напісаў А. Х. Шкляр. Гэта першая работа такога характару.

Дацэнт С. М. Зубаў закончыў працаваць над III часткай вучэбнага дапаможніка па фізічнай геаграфіі СССР. Яна выйдзе да юбілею рэспублікі.

Нядаўна здадзена ў друк праца аб ландшафтах паўночнай і сярэдняй Беларусі, напісаная мной сумесна з Г. І. Марцінкевіч.

Апрача гэтага, да юбілею Беларусі мы рыхтуем выстаўкі, стэнды, якія адлюстроўваюць дасягненні ў рэспубліцы і па нашай кафедры ў галіне фізічнай геаграфіі.

## Фоталетапіс сесіі

**Доўгі час працуе на юрфаку прафесар Ф. І. Гаўзе. Ён выкладае савецкае грамадзянскае права. На здымку ўверсе Ф. І. Гаўзе прымае экзамен у студэнта III курса Л. Сабалеўскага.**

**Экзамен па матэматычнаму аналізу у першакурснікаў фізічнага факультэта прымае прафесар А. Я. Турэцкі.**

**Трэцякурснікі матэматычнага факультэта здаюць экзамен выкладчыку У. Г. Спрынджуку.**

**Уладзімір Кацуба і Віктар Кісялёў, трэцякурснікі геолага-геаграфічнага факультэта, рыхтуюцца да чарговага экзамена.**

Фота І. Асіпкі



Чэрвень — асабліва ўраджайны месяц для універсітэта на дысертацыі. Амаль кожны тыдзень то ў адным, то ў другім Вучоным савеце арганізуецца абарона навуковых прац. Наш карэспандэнт І. Аскірка зняў маладога даследчыка — выкладчыка кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў М. Пашкевіча (крайні справа) у час выступлення перад Вучоным саветам.

# ЮБІЛЕЙ ГІСТОРЫКА

*Не ўпершыню супрацоўнікі навуковай чытальнай залы арганізоўваюць выстаўкі прац вучоных-юбіляраў. Вось і нядаўна яны афармілі выстаўку да 50-годдзя з дня нараджэння кандыдата гістарычных навук Уладзіміра Рыгоравіча Івашына.*

*75 навуковых прац і артыкулаў — гэта не поўны пералік апублікаваных работ У. Р. Івашына. На суцільным стэндзе размясціліся кнігі аўтара і артыкулы, змешчаныя ў часопісах «Блакнот агітатара», «Камуніст Беларусі» і многіх газетах.*

*У гэтых працах — гісторыя Беларусі, якая ідзе да свайго юбілею.*

*У МЯСЦКОМЕ*

# СПРАВАЗДАЧА ФІЗІКАЎ

Нядаўна мясцовы камітэт універсітэта абмеркаваў работу прафсаюзнага бюро фізічнага факультэта. У дакладзе старшыні прафбюро тав. Сабіла і выступленнях тт. Жмойдзяка, Мардыкіна, Мяцельскага адзначан шэраг станоўчых момантаў у рабоце прафсаюзнага актыва. Так, прафбюро выступіла ініцыятарам арганізацыі савета па рабоце з куратарамі, замацавання да вучэбных груп удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, паклапацілася аб стварэнні камісіі па забеспячэнню супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта навукова-метадычнай літаратурай. Жыццё факультэта перыядычна асвятляецца ў насценным друку і шматтыражнай газеце «Беларускі універсітэт».

Заслугоўвае належнай увагі работа метадычных камісій па каардынацыі вучэбных праграм, методыка чытання асобных курсаў і правядзення практычных і лабараторных заняткаў. Вытворчая камісія прафбюро сумесна з камісіяй па ахове працы і тэхніцы бяспекі, а таксама дэканатам робіць праверку санітарнага становішча лабараторый і аўдыторый, сочыць за ўтрыманнем правіл тэхнікі бяспекі лабарантамі.

Жыллёва-бытавая камісія сумесна з дэканатам распрацавала правілы ўнутранага распарадку і ўкараняе іх у жыццё.

Вялікую ўвагу ўдзяляе прафбюро палітыка-выхаваўчай рабоце ў групах. У полі яго зроку работа куратараў, двух філасофскіх семінараў, арганізацыя вытворчых практык студэнтаў.

На пасяджэнні ішла размова і аб недахопах у рабоце прафбюро. Не заўсёды здзяйсняецца кантроль за выкананнем прынятых рашэнняў і пастаноў. Несвоечасова, а бывае і зусім не афармляюцца пратаколы пасяджэнняў камісій прафбюро, не аформлены акты жыллёва-бытавога абследавання некаторых супрацоўнікаў. Нездавальняюча плацяцца членскія ўзносы — 93 супрацоўнікі маюць запазычанасць ад двух месяцаў да года. Малую ўвагу ўдзяляе прафбюро індывідуальнай рабоце са студэнтамі, не наладжаны кантакт са студэнцкім прафбюро.

У пастанове мясцовы камітэт абавязаў прафбюро ліквідаваць ускрытыя недахопы, глыбей унікаць у навучальны працэс і навукова-даследчую работу. Асаблівая ўвага звернута на своечасовае правядзенне падпіскі на газеты і, у прыватнасці, на газету «Беларускі універсітэт». Прафбюро прапанавала выдзеліць на кожнай кафедры адказнага за падпіску і дастаўку універсітэцкай шматтыражкі.

У сувязі з падрыхтоўкай да юбілею рэспублікі і Кампартыі Беларусі прафбюро прапанавана пастаянна праводзіць кантроль за ходам выканання сацыялістычных абавязацельстваў, узятых кафедрамі і супрацоўнікамі факультэта.

**Р. ДАНІЛЕВІЧ.**





*НА ЗДЫМКАХ: студэнт падрыхтоўчага факультэта в'етнамец Нгуен Зань Тханг здае выпускны экзамен па фізіцы намесніку дэкана, загадчыку кафедры прыродазнаўчых дысцыплін Уладзіміру Мікітавічу Стрэльчанку. А Нгуен Тхі Мінь Чы (на пярэднім плане) і Нгуен Фыонг Ха яшчэ толькі рыхтуюцца да адказу на пытанні білета.*

*Фота Я. ДАНІЛАВА.*

# ШЛЯХАМІ ДРУЖБЫ

З ГІСТОРЫІ ІНТЭРТУРЫЗМА

ТУРЫЗМ — любімы від адпачынку многіх студэнтаў. Улічваючы гэта, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, ЦК ЛКСМБ і Беларускі Савет прафсаюзаў штогод, пачынаючы з 1965 года, арганізуюць турысцкія аўтапаязды дружбы для савецкіх і замежных студэнтаў навучальных устаноў нашай сталіцы.

Першы інтэрнацыянальны поезд дружбы ў перыяд зімовых канікул 1964-1965 навучальнага года накіраваўся на цэлых пяць дзён у горад-герой на Няве — легендарны Ленінград. Гэты поезд дружбы ўзначальваў тады супрацоўнік нашага універсітэта У. Мухаеў.

У ліпені 1965 года ў час летніх канікул для савецкіх і замежных студэнтаў беларускай сталіцы быў арганізаваны аўтапоезд «Дружба» па гарадах і сёлах Беларусі і Літвы. Яго ўзначаліў таксама супрацоўнік нашага універсітэта Ц. Старчанка.

Роўна праз год аўтапоезд «Дружба» падарожнічаў па Беларусі і Украіне, а ўлетку 1967 года яго маршрут пралёг праз гарады і сёлы паўночнай, усходняй і паўднёвай частак нашай рэспублікі.

Савецкія і замежныя студэнты, што навучаюцца ў БДУ імя У. І. Леніна, заўсёды былі актыўнымі ўдзельнікамі гэтых падарожжаў. Мне, як удзельніку ўсіх пералічаных паяздоў дружбы, прыемна адзначыць, што тыя, хто адпраўляўся ў цікавыя падарожжы, ніколі не шкадавалі, заўсёды былі задаволены, вярталіся дамоў узмужнелымі і загарэўшымі ў дарозе ад сонца. А галоўнае — кожны вяртаўся з пашыраным кругаглядам, з мноствам самых лепшых уражанняў ад усяго ўбачанага і пачутага ім у час падарожжа. Турысты атрымлівалі вялікую магчымасць лепш пазнаёміцца з дасягненнямі нашага народа ў эканамічным і культурным развіцці, са слаўнымі працоўнымі і баявымі традыцыямі нашага народа, яго звычаямі, яго імкненнем да міру, да светлага будучага чалавецтва.

У многіх з'явіліся ў розных мясцінах новыя знаёмыя, добрыя сябры, завязалася перапіска... Мы сустракалі выпускнікоў нашага універсітэта і іншых навучальных устаноў Мінска, якія зараз працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі.

Красамоўны такі факт. Кубінец Луіс Эрнандэс ездзіў з аўтапоездам «Дружба» летам 1966 года, калі ён толькі яшчэ закончыў падрыхтоўчы факультэт нашага універсітэта. А праз год, будучы ўжо студэнтам Кіеўскага палітэхнікума сувязі, ён вельмі прасіўся ў другі раз паехаць з «Дружбай». Так спадабаліся юнаку падарожжы па нашаму краю. І яму, зразумела, не адказалі ў пуцёўцы.

А вось аб чым пісала летась былы намеснік прэзідэнта зямляцтва в'етнамскіх студэнтаў падрыхтоўчага факультэта, зараз студэнтка фізфака нашага універсітэта в'етнамка Нго Тхі Ба: «З аўтапоездам мы пабывалі ў многіх гарадах і сёлах Беларусі. Шмат чаго ўбачылі, усюды сустракаліся з савецкімі людзьмі. Гэтыя сустрэчы цёплыя і радасныя». Сцісла, проста, але выразна.

Сёлета, раніцай 9 ліпеня, па маршруту Мінск — Обаль — Наваполацк — Віцебск — Орша — Горкі — Магілёў — Гомель — Светлагорск — Любань — Мінск зноў адправіцца ў падарожжа вясёлая і нястомная «Дружба». Яе ўзначаліць, як і ў мінулым годзе, старшы інспектар Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР Генрых Іванавіч Гракаў. Намеснікам начальніка аўтапоезда па культурна-масавай рабоце вылучан намеснік загадчыка аддзела навучэнцаў і студэнцкай моладзі Мінскага гаркома камсамола Аўгусцін Юзэфовіч.

Сяміаўтобусная «Дружба», нібы сухапутная «Брыганціна», павядзе ў нязведаныя далі каля 200 дапытлівых пасажыраў — прадстаўнікоў розных краін, розных кантынентаў. Сярод іх ёсць студэнты БПІ, медыцынскага інстытута, педагагічнага інстытута замежных моў, тэхнікума сувязі і іншых навучальных устаноў. Большасць пасажыраў аўтапоезда складаюць савецкія і замежныя студэнты БДУ імя У. І. Леніна.

«Дружба» пройдзе каля двух тысяч кіламетраў і вернецца назад у сталіцу толькі позна вечарам 20 ліпеня.

Турысты ўбачаць усю прыгажосць маляўнічай прыроды беларускага краю, яго магутныя рэкі, такія, як Заходняя Дзвіна, Днепр, Сож, зялёныя і шумлівыя лясы, прасторы шырокіх калгасных палёў...

Гэты год — юбілейны год для беларускага народа, ён сустракае слаўнае 50-годдзе сваёй рэспублікі і Кампартыі Беларусі. А камсамольцы, усе юнакі і дзяўчаты рыхтуюць дастойную сустрэчу 50-годдзю ВЛКСМ. І ўсюды кіпіць стваральная праца нашай слаўнай савецкай моладзі, нашага народа, уладарыць новы працоўны ўздым, творчае імкненне ўперад. Растуць нашы гарады, прыгажэюць вёскі, зацвітаюць новыя сады, учарашнія багны пераўтвараюцца ў квітнеючыя палеткі. Турысты сваімі вачыма ўбачаць, як савецкія людзі напружана змагаюцца за новыя поспехі ў камуністычным будаўніцтве, пераканаюцца, што нашаму народу патрэбен толькі мір, каб жыць заможна і шчасліва, у дружбе з усімі народамі свету.

Удзельнікі аўтапоезда «Дружба» наведаюць буйнейшыя заводы і месцы партызанскай славы, такія, як Орша, дзе дзейнічаў Канстанцін Заслонаў са сваімі баявымі сябрамі, як востраў Зыслаў, што на Любаншчыне, дзе ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі размяшчаўся партызанскі аэрадром, які прымаў самалёты з Вялікай Зямлі, і іншыя мясціны.

Удзельнікі турысцкага інтэрнацыянальнага аўтапоезда «Дружба» пабываюць у старажытных беларускіх гарадах, апетых легендамі, і ў новых, маладых камсамольскіх гарадах, такіх, як Наваполацк і Светлагорск.

І добра будзе, калі кожны возьме з сабою ў падарожжа ну хоць бы адну з сваіх самых любімых песен. Бо песня стане нашай спадарожніцай на вечарах інтэрнацыянальнай дружбы. З ёю, як з крылатаю ластаўкай, заўсёды лягчэй і весялей у дарозе.

У добры час, у добры шлях, сябры!

**У. ГАЛАЙША,**
намеснік начальніка аўтапоезда «Дружба».

